# ПАНЯЦЦЕ І ПРЫКМЕТЫ ЗЛАЧЫНСТВА Ў КРЫМІНАЛЬНЫМ ЗАКОНЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (XV–XVI стст.)

***Я. А. Кацельнік***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Крымінальнае права на тэрыторыі Беларусі існуе са старажытных часоў, пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца. Першапачаткова яго крыніцай з'яўляліся звычаі, якія паступова набывалі агульнаабавязковы характар, замацоўваліся судовай практыкай і ўпісваліся ў дзяржаўныя законы.

Аналіз першых заканадаўчых актаў Вялікага княства Літоўскага дазваляе гаварыць аб дастаткова высокім для свайго часу ўзроўні развіцця крымінальнага закона. Ужо ў XV ст. у сувязі з цэнтралізацыяй дзяржавы пачалася праца па ўніфікацыі ўсяго заканадаўства, вынікам якой з'явіўся першы кадыфікаваны крымінальны закон ВКЛ – Судзебнік Казіміра 1468 г., які замацаваў шмат прагрэсіўных палажэнняў (індывідуалізацыю адказнасці, прадугледжанасць злачынства ў законе і інш.).

На працягу XVI ст. большасць інстытутаў крымінальнага права значна змянілася. Гэта адлюстравалася ў першую чаргу ў агульнадзяржаўных зводах законаў – Статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.

Працэс эвалюцыі крымінальнага закона знайшоў адлюстраванне перш за ўсё ў поглядах на сутнасць і змест злачыннага дзеяння на розных этапах развіцця дзяржавы. Спачатку змест злачынства азначаўся толькі яго знешняй праявай – нанясеннем шкоды прыватнай асобе; пазней заканадаўца звяртае ўвагу на тое, што злачынец умешваецца ў сферу прыватных правоў асобы, а на больш познім этапе развіцця дзяржавы і права азначае пасягненне на грамадскі правапарадак як прыроду злачынства.

У крымінальным законе сустракаюцца розныя назвы злачынных дзеянняў: «выступ», «выступок», «кривда», «учинок», «злочинство», «шкода», «гвалт», «вина», «збыток». Усе гэтыя тэрміны адлюстроўваюць розныя прыкметы злачынства. Так, Судзебнік Казіміра 1468 г. ужывае тэрмін «праступак», чым указвае на такую прыкмету злачыннага дзеяння,

як супрацьпраўнасць. Неабходна адзначыць, што прагрэсіўнай з’яўлялася норма Судзебніка, якая прадугледжвае немагчымасць пакарання за дзеянне, якое непасрэдна не прадугледжана ў законе. Першы Статут 1529 г. яшчэ часам працягвае ўжываць тэрмін «кривда», тым самым азначае злачынства як прычыненне шкоды асобе, аднак звяртае ўвагу і на супрацьпраўнасць дзеяння. Статут 1588 г. не толькі звяртае ўвагу на грамадскую небяспеку, якую нясе злачыннае дзеянне, яго ганебнасць і грахоўнасць, але і адзначае, што злачынства – гэта шкода не толькі пацярпеламу, а яшчэ і шкода дзяржаве, аб чым сведчаць тэрміны «проступка» і «выступ з права». У некаторых выпадках заканадаўца пры апісанні злачынства ўказвае яшчэ і на амаральнасць такога дзеяння.

Многія азначэнні злачынства ў законе перш за ўсё непасрэдна ўказвалі на яго накіраванасць на канкрэтныя грамадскія адносіны. Так, тэрмін «гвалт» ужываўся для апісання рознага роду самаўпраўных дзеянняў, а тэрмін «збыток» – для апісання рознага роду хуліганскіх дзеянняў.

Такім чынам, агульнага азначэння злачынства і аднолькавага апісання ў заканадаўстве ВКЛ няма, аднак на падставе аналізу крымінальных норм таго часу можна зрабіць вывад, што пад злачынствам разумеўся супрацьзаконны, віноўны ўчынак (дзеянне ці бяздзейнасць), які ўключаў у сябе элемент грамадскай небяспекі і рабіў замах на феадальны грамадскі лад, правапарадак, уласнасць, асобу, яе правы і інтарэсы.